**А. Д. Іванюшава**

# СЕМАНТЫКА МАДАЛЬНАСЦІ НЕАБХОДНАСЦІ ПАРЭМІЙ З КАМПАНЕНТАМ *ТРЭБА* Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Даследаванне прысвечана аналізу беларускіх парэмій з канструкцыяй *трэба + інфінітыў*. Мэта даследавання – выявіць аб'ём семантыкі мадальнасці неабходнасці ў беларускіх парэміях з кампанентам *трэба*. Фактычным матэрыялам паслужылі 130 парэміялагічных адзінак, вылучаных метадам суцэльнай выбаркі са зборніка «Прыказкі і прымаўкі» ў 2-х кнігах пад рэдакцыяй М. Я. Грынблата.

Мадальнае значэнне неабходнасці перадае непазбежнае і безальтэрнатыўнае пераўтварэнне патэнцыйнага ў актуальнае. Патэнцыйнасць, у выпадку даследаванай канструкцыі, выражана лексічна, з дапамогай безасабовага прэдыкатыва *трэба*: *Каб зварыць страву,* ***трэба*** *пасячы старую лаву;* ***Трэба*** *ўлетку назбіраць, каб зімою было што жаваць*; *Каля пекла жывучы, то* ***трэба*** *і чорта за кума папрасіць; Не* ***трэба*** *таму богу маліцца, які на цябе не глядзіць; Не* ***трэба*** *песціць, як ёсць, дзе змесціць; Не век дзеўкай дзевавацъ,* ***трэба*** *шчасця папытаць; Мы не папы, не ксяндзы, нам не* ***трэба*** *спавядацца; Прадаць – адны лапці стаптаць, купіць –* ***трэба*** *дзесяць знасіць; Каб у пашане быць,* ***трэба*** *працу любіць*. Дзеянне ў такіх прыказках прадстаўлена як патэнцыйнае. Сінтаксема з кампанентам *трэба* не азначае той факт, што дзеянне варта рабіць абавязкова, толькі чалавеку, які жадае *у пашане быць*, неабходна *працу любіць*. Такім чынам, семантыку спалучэння *трэба + інфінітыў* можна лічыць адпаведнай мэтазгоднаму выкананню дзеяння, якое паспрыяе дасягненню мэты, якая суадносіцца з суб'ектам і яго інтарэсамі, а таму і заслугоўвае намаганняў. Іншымі словамі, безасабова-прэдыкатыўнае слова *трэба* ўключае ў сябе сінтэз магчымасці, пажаданасці і неабходнасці, тым самым выражае запатрабаванасць дзеяння.

Абодва кампаненты канструкцыі з'яўляюцца безасабовымі і фіксуюць толькі стан неабходнасці, а не абавязковасць дзеяння ці адказнасць за яго выкананне: ***Трэба*** *знаць, дзе што сказаць; А людзям* ***трэба*** *людзьмі жыць; Не ганіся за чужым, не* ***трэба*** *будзець плаціць сваім; Калі хоч хлеб меці, то* ***трэба*** *зямліцы глядзеці; Хочаш грыбоў набраць –* ***трэба*** *рана устаць; Замуж выйсці –* ***трэба*** *знаці: позна легчы, рана ўстаці; Як стары ў двары, то не* ***трэба*** *дзяржаць сабаку – ён усіх аббрэша; Хто не знае, таму і знаць не* ***трэба***. Гэта сведчыць пра тое, што дзеянне знаходзіцца ў полі неаблігаторнасці і неакцыянальнасці, а мадальныя катэгорыі неабходнасці прадстаўлены незалежнымі ад суб'екта.